Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

# ТЭХНАЛОГІІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 14 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэг. № Е23-1-75/17 вуч. ад 04.07.17 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Л. І. Казлоўская,* загадчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Т. П. Бірукова,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*А. В. Рабава,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;
*Н. І. Гуд,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў;
*Н. В. Сівіцкая,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
*М. У. Камоцкі,* выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*В. М. Наумчык,* прафесар кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі», доктар педагагічных навук, прафесар;
*Л. Л. Ражкова,* загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 28.03.2018 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 19.04.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Л. І. Казлоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць.

Вучэбная дысцыпліна «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» з’яўляецца прафесійна значнай для падрыхтоўкі спецыялістаў, якім неабходна вырашаць складаныя і рознабаковыя задачы сучаснага культурнага жыцця.

У праграме дысцыпліны абагульнены тэарэтычныя веды ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці, а таксама перададзены вопыт, назапашаны ва ўстановах культуры. Дадзены падыход вызначыў логіку пабудовы зместу вучэбнай дысцыпліны, якая ўключае наступныя раздзелы: «Тэхналогія гульнявой дзейнасці», «Тэхналогія культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці», «Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці», «Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці».

Змест вучэбнай дысцыпліны забяспечвае лагічнае працягненне і паглыбленне ведаў, атрыманых студэнтамі ў выніку авалодання такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Педагогіка і псіхалогія», «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Менеджмент, маркетынг, фінансаванне, рэклама ва ўстановах сацыякультурнай сферы» і іншымі з цыкла агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін.

*Мэтай* вывучэння вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў тэарэтычных ведаў шматзначнасці тэхналагічнай сістэмы сацыяльна-культурнай дзейнасці і практычных навыкаў выкарыстання тэхналагічнага патэнцыялу галіны ў распрацоўцы і рэалізацыі сацыякультурных праектаў і праграм, пошуку інавацыйных рашэнняў актуальных праблем сацыяльна-культурнай сферы.

Асноўныя *задачы* курса:

– фарміраванне ведаў агульнай структуры і спецыфікі тэхналагічнага працэсу ў сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– фарміраванне ведаў і практычных навыкаў у ажыццяўленні гульнявой, культурна-рэкрэацыйнай, інфармацыйна-дыскусійнай, святочна-абрадавай дзейнасці;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выпрацоўка практычных навыкаў, выкарыстанне тэхналагічнага патэнцыялу галіны ў распрацоўцы і рэалізацыі сацыяльна-культурных праектаў у галіне адукацыі, мастацтва, вольнага часу, спорту, турызму і г. д.;

– развіццё творчых і прафесійных здольнасцей студэнтаў.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– тэорыю гульні як кампанент культуры, яе педагагічныя магчымасці, сацыяльную сутнасць і ролю ў арганізацыі культурна-забаўляльнай дзейнасці;

– архітэктоніку (кампазіцыйную пабудову стварэння) розных відаў гульнявых праграм;

– асноўныя формы арганізацыі культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці;

– формы і метады арганізацыі інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці ва ўстановах сацыяльна-культурнай сферы;

– святочна-абрадавую культуру беларусаў;

– асноўныя этапы працы над сцэнарыем свята;

*умець:*

– арганізоўваць і ажыццяўляць розныя віды гульнявых праграм з улікам асаблівасцей сацыяльных груп насельніцтва;

– ажыццяўляць пастаноўку культурна-рэкрэацыйных праграм з рознымі катэгорыямі насельніцтва;

– выкарыстоўваць асноўныя метады і прыёмы ў распрацоўцы інфармацыйна-дыскусійных праграм у соцыуме;

– улічваць рэгіянальныя асаблівасці пры арганізацыі святочна-абрадавай дзейнасці;

*валодаць:*

– культурай мовы, педагагічным тактам і эстэтычным густам;

– прыёмамі стварэння ўмоў для міжасабовых зносін удзельнікаў культурна-рэкрэацыйных праграм;

– прыёмамі адбору інфармацыі згодна з інфармацыйна-дыскусійнымі праграмамі;

– тэхналогіямі арганізацыі свят і абрадаў беларусаў.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае тэарэтычныя веды аб асноўных паняццях, змесце, інструментарыі сацыяльна-культурных тэхналогій; аб прынцыпах, формах і метадах сацыяльна-культурнага праектавання. Практычная частка курса разлічана на развіццё навыкаў самастойнай распрацоўкі сту-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэнтамі культурна-адпачынкавых праграм і сацыяльна-культурных праектаў з улікам асаблівасцей канкрэтнага соцыуму і рэгіёна.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам пасля завяршэння навучання ва ўстанове вышэйшай адукацыі спецыяліст сацыякультурнай сферы павінен быць падрыхтаваны да розных відаў дзейнасці, якія суадносяцца з акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі і прафесійнымі кампетэнцыямі.

Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця, самастойна прымаць прафесійныя рашэнні, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага і сацыякультурнага жыцця грамадства.

Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста:

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста:

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсу стварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджвання каштоўнасцей культуры.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-6. Уключаць людзей у працэс бесперапыннай адукацыі, сацыяльна-культурнай творчасці і рэкрэацыйна-забаўляльнага вольнага часу.

ПК-8. Набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

ПК-11. Выяўляць інтарэсы і педагагічныя патрэбнасці насельніцтва ў розных відах вольнага часу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з мэтай і задачамі дадзенай дысцыпліны асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання з’яўляюцца: праблемнае навучанне (часткова пошукавы і даследчыя метады); інтэрактыўныя тэхналогіі, заснаваныя на формах і метадах актыўнага навучання; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, круглы стол, майстар-клас і інш.).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» адведзена 660 гадзін, з іх 314 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 68 гадзін, лабараторныя – 246 гадзін. Рэкамендаваныя формы кантролю – залік і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Тэхналогія гульнявой дзейнасці

*Тэма 1. Уводзіны.*
*Педагагічныя магчымасці гульні ў выхаванні асобы*

Месца і роля раздзела «Тэхналогія гульнявой дзейнасці» ў структуры вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці». Мэта і задачы раздзела «Тэхналогія гульнявой дзейнасці», яго асноўны змест. Структура раздзела «Тэхналогія гульнявой дзейнасці» і яго вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

Гульня як від чалавечай дзейнасці. Праца – аснова паходжання і развіцця гульні. Адлюстраванне ў гульні характэрных бакоў працы і побыту чалавека, спецыфіка гульнявых зносін. Гульня і развіццё пазнавальнай дзейнасці чалавека. Гульня і развіццё творчай дзейнасці чалавека. Гульня і фізічнае развіццё чалавека.

*Тэма 2. Месца гульні ў культурнай дзейнасці асобы*

Гульня як частка культуры народа. Погляды на гульню Ё. Хейзінгі, Э. Берна, М. М. Бахціна, Л. С. Выгоцкага, Д. Б. Эльконіна, У. Я. Суртаева. Узаемасувязь гульні і мастацтва. Гульня як від адпачынкавай дзейнасці чалавека. Развіццё гульнявога жанру ў Рэспубліцы Беларусь. Народная гульня як частка духоўнай культуры народа. Адлюстраванне культурных традыцый у змесце гульні.

*Тэма 3. Асаблівасці выкарыстання гульні ў клубных*
*і пазашкольных установах*

Паняцці «гульнявая форма», «гульнявы кампанент», «гульнявая праграма». Асаблівасці ўключэння гульні ў культурна-адпачынкавыя праграмы. Віды гульнявых праграм і іх характарыстыка. Прынцыпы адбору гульні для культурна-адпачынкавых праграм. Гульня як спосаб уцягнення гледача ў масавае дзейства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Функцыі гульні. Класіфікацыя гульняў*

Характарыстыка функцый гульні. Параметры, якія пакладзены ў аснову класіфікацыі гульні. Аналіз існуючай класіфікацыі гульняў А. С. Макаранкі, Ю. А. Стральцова, А. В. Разумнага, В. М. Грыгор'ева, Л. І. Казлоўскай. Характарыстыка інтэлектуальных гульняў, гульняў фізічнага развіцця, гульняў-драматызацый, арганізацыйна-дзейсных гульняў.

*Тэма 5. Асаблівасці арганізацыі гульні з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту*

Улік узроставых асаблівасцей пры арганізацыі гульняў. Патрабаванні да зместу гульняў. Развіццё сюжэта – важнае патрабаванне пры правядзенні гульні з малодшымі школьнікамі. Методыка правядзення гульняў, якія развіваюць мысленне. Развіццё ініцыятывы, вынаходлівасці дзяцей пры правядзенні гульнявога працэсу. Педагагічныя патрабаванні да кіраўніцтва гульнявым працэсам дзяцей. Гульнятэка малодшага школьніка.

*Тэма 6. Асаблівасці арганізацыі гульняў з падлеткамі і моладдзю*

Матывы ўключэння падлеткаў і моладзі ў гульнявую дзейнасць. Асаблівасці зносін падлеткаў і моладзі ў працэсе правядзення гульні. Стварэнне ўмоў для праяўлення самадзейнасці, ініцыятывы і вынаходлівасці падлеткаў і моладзі – аснова арганізацыі гульнявога працэсу. Характарыстыка этапаў гульнявога працэсу. Асаблівасці кіравання гульнявым працэсам падлеткаў і моладзі. Гульнятэка для падлеткаў і моладзі.

*Тэма 7. Гульнявая праграма як форма культурна-адпачынкавай дзейнасці*

Драматургія гульнявых праграм. Кампазіцыйная пабудова праграмы. Эпізод як першапачатковая ячэйка сцэнарыя. Уключэнне маналогаў вядучага, песень, танцаў, карагодаў, флэшмобаў, мультымедыйных сродкаў у сцэнарый праграмы. Канфлікт у сцэнарыі гульнявой праграмы. Мантаж гульнявых эпізодаў. Лагічнасць, рытмічнасць пераходаў і тэкставых звязак у сцэнарыі гульнявой праграмы. Падбор і чаргаванне гульнявых момантаў у залежнасці ад выяўлення інтэлектуальных і фізічных здольнасцей аўдыторыі. Сюжэтны ход праграмы. Увядзенне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персаніфікаваных вобразаў у праграму. Прыёмы актывізацыі гульнявой дзейнасці гледачоў. Музычнае і мастацкае афармленне праграмы. Прызы, прадметы-сімвалы ў праграме. Крытэрыі ацэнкі праграмы.

*Тэма 8. Тэхналогія мадэлявання гульнявых праграм*

Узроўні мадэлявання. Этапы мадэлявання. Аналіз вядомых гульнявых праграм. Перанясенне зместу праграмы ў мясцовыя ўмовы. Унясенне элементаў навізны ў змест праграмы, сцэнарны ход, арганізацыйна-метадычныя ўмовы, тэхнічныя сродкі. Складанне новай мадэлі гульнявой праграмы.

*Тэма 9. Прафесійныя якасці вядучага гульні*

Агульная эрудыцыя, густ, такт, пачуццё гумару вядучага праграмы. Імідж і сцэнічны касцюм вядучага і яго роля ў правядзенні праграмы. Таварыскасць, уменне лёгка збліжацца з людзьмі – галоўныя патрабаванні да вядучага гульні. Акцёрскае майстэрства, мастацтва імправізацыі – неабходныя ўмовы творчай работы вядучага праграмы. Тэхніка вядзення праграм рознага зместу. Асаблівасці работы вядучага на розных этапах гульні. Запрашэнне на гульню, тлумачэнне ўмоў гульні, забеспячэнне ходу гульні, падвядзенне вынікаў гульні.

## Раздзел 2. Тэхналогія культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці

*Тэма 10. Уводзіны. Сацыяльная і псіхафізіялагічная сутнасць культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці*

Месца і роля раздзела «Тэхналогія культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці» ў структуры вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогіі СКД». Прадмет і аб’ект культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Паняцці «вольны час», «адпачынак», «рэкрэацыя» «забава». Вольны час у кантэксце рэкрэацыйнай дзейнасці. Узроўні вольнага часу: адпачынак, забава, асвета, самасузіранне, творчасць, свята. Сутнасць культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці, яе спецыфічныя асаблівасці. Сацыяльныя функцыі і прынцыпы арганізацыі культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Сістэма культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Месца і роля пазашкольных устаноў і ўстаноў культуры ў гэтай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 11. Культурна-рэкрэацыйная дзейнасць як педагагічная сістэма*

Выхаваўчы патэнцыял культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Педагагічныя асаблівасці адпачынку і забавы. Асноўныя задачы «педагогікі вольнага часу». Віды культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці: зносіны ў вольны час, гульня, аматарскае мастацкае выканальніцтва, успрыманне каштоўнасцей культуры (індывідуальнае і публічна-відовішчнае). Педагагічнае «кіраванне» культурна-рэкрэацыйнай дзейнасцю. Педагагічныя метады кіравання. Крытэрыі эфектыўнасці культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Майстэрства вядучага культурна-рэкрэацыйных праграм.

*Тэма 12. Паняцце і класіфікацыя культурна-рэкрэацыйных праграм. Характарыстыка арганізацыі штодзённага адпачынку*

Агульнае паняцце аб сродках, формах і метадах культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Асноўныя сродкі і іх характарыстыка: жывое і вуснае слова, аматарскае мастацка-масавае выкананне, творы друку, разнастайныя віды нагляднасці, мастацкія сродкі, гульнявыя, аўдыявізуальныя і г. д. Культурна-рэкрэацыйныя формы і іх класіфікацыя: па прыкмеце накіраванасці дзейнасці; па колькасці людзей; па выкарыстанні сродкаў выразнасці; па ступені актыўнасці; прынцыпе дыферэнцыяцыі. Метады культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці, іх класіфікацыя. Культурна-рэкрэацыйная праграма. Тэхналогія яе падрыхтоўкі і правядзення. Арганізацыя штодзённага адпачынку і яе асаблівасці.

*Тэма 13. Комплексныя культурна-адпачынкавыя праграмы, іх характарыстыка*

Паняцце «комплексная культурна-рэкрэацыйная праграма» як форма спалучэння разнастайных відаў дзейнасці. Узаемасувязь асноўных забаўляльных кампанентаў з інфармацыйнай і выхаваўчай дзейнасцю. Спецыфіка арганізацыі адпачынкавых зносін у камерных формах. Вячоркі, салоны, творчыя сустрэчы – іх спецыфіка. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці іх правядзення. Шматпраграмныя вечары адпачынку – спосаб злучэння ўсіх забаўляльных кампанентаў, злучэнне прадстаўлення і масавага дзейства. Асноўныя тыпы і віды вечароў. Ды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скатэка – шматварыянтная форма адпачынку. Прафесійныя якасці вядучага дыскатэк.

*Тэма 14. Арганізацыя культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці ў выхадныя і святочныя дні*

Арганізацыя культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці ў выхадныя дні. Спецыфічныя асаблівасці калектыўных, сямейных дзён адпачынку. Клуб выхаднога дня. Псіхолага-педагагічная патрэбнасць у арганізацыі свят. Характарыстыка асноўных святочных культурна-рэкрэацыйных форм: баль, карнавал, агеньчык, відовішча. Віды баляў, іх спецыфічныя асаблівасці. Агеньчык – як камерная святочная форма, якая спалучае ў сабе інфармацыйна-пазнавальную і культурна-забаўляльную дзейнасць. Відовішча як форма спалучэння функцый рэкрэацыі (геданічная, кампенсатарная, забаўляльная), іх класіфікацыя. Карнавал як частка святочнага адпачынку. Мадэляванне культурна-рэкрэацыйных праграм. Этапы мадэлявання. З’яўленне і развіццё інавацыйных форм культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці.

*Тэма 15. Падрабязная распрацоўка сцэнарных планаў асноўных комплексных культурна-рэкрэацыйных праграм*

Структура праграмы як спалучэнне разнастайных кампанентаў культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці. Распрацоўка сцэнарных планаў камерных форм адпачынку, шматпраграмных вечароў адпачынку. Распрацоўка калектыўнага дня адпачынку: сямейны дзень адпачынку, карпаратыўны дзень адпачынку, дзень адпачынку па месцажыхарстве, дзень адпачынку прадпрыемства, навучальнай установы і г. д. Распрацоўка плана арганізацыі штодзённага адпачынку для разнастайных узроставых груп насельніцтва, выкарыстоўваючы веды, атрыманыя ў перыяд азнаямляльнай практыкі ў разнастайных установах культуры.

*Тэма 16. Методыка распрацоўкі сцэнарыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы*

Ідэйна-тэматычная задума культурна-рэкрэацыйнай праграмы. Алгарытм распрацоўкі праграмы. Распрацоўка сюжэта сцэнарыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы. Вывучэнне і адбор сродкаў выразнасці ў раскрыцці эпізодаў праграмы. Кампазі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйны мантаж эпізодаў і блокаў сцэнарыя праграмы. Літаратурны запіс сцэнарыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы.

*Тэма 17. Тэхналогія падрыхтоўкі*
*і правядзення культурна-рэкрэацыйных праграм*

Распрацоўка рэжысёрска-пастановачнага плана сцэнарыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы. Праца з вядучымі, выканаўцамі і ўдзельнікамі праграмы. Распрацоўка тэхнічнага, музычна-мастацкага афармлення культурна-рэкрэацыйнай праграмы. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу. Тэхнічна-мантажная рэпетыцыя праграмы. Генеральная рэпетыцыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы і яе паказ.

## Раздзел 3. Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці

*Тэма 18. Уводзіны. Мэта і задачы раздзела*
*«Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці»*

Месца і роля раздзела «Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці» ў структуры вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогіі СКД».

Мэта, задачы, структура раздзела «Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці». Інфармацыя, сацыяльная інфармацыя як асноўныя катэгорыі інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці. Інфармацыйны працэс. Інфармацыйныя ўзроўні і іх характарыстыка. Характарыстыка паняцця «дыскусія».

*Тэма 19. Інфармацыйна-адукацыйная*
*дзейнасць у кантэксце арганізацыі вольнага часу асобы*

Кірункі і асноўныя функцыі інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці: інфармацыйна-асветніцкая, выхаваўчая, адукацыйная. Інфармацыя, сацыяльная інфармацыя як асноўныя катэгорыі раздзела. Прыкметы і класіфікацыя інфармацыі, сацыяльнай інфармацыі. Інфармацыйны працэс. Інфармацыйныя ўзроўні і іх характарыстыка. Прыкметы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці: інтэнсіўнасць зместу, даступнасць, вольны характар, адсутнасць жорсткай рэгламентацыі і інш. Інфармацыйна-адукацыйная дзейнасць як педагагічны працэс: мэты, задачы, прынцыпы арганізацыі, суб’екты дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 20. Формы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці*

Класіфікацыя форм інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці: арганізацыйныя формы (індывідуальныя, групавыя, масавыя) і метадычныя (вусныя, друкаваныя, наглядныя, комплексныя). Віды арганізацыйных форм: гурткі, школы, курсы, студыі, майстэрні, народныя ўніверсітэты. Характарыстыка відаў метадычных форм. Вусныя формы: лекцыі, даклады, гутаркі, чытанні, кіналекторыі і інш. Друкаваныя формы: праспект, брашура, бюлетэнь, газета клубная і інш. Наглядныя формы: «куток», плакат, «лісток» і інш.

*Тэма 21. Інфармацыйна-дыскусійная дзейнасць як неад’емны кірунак інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці.*
*Сродкі і метады інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці*

Папулярызацыя навуковых ведаў і шырокае распаўсюджванне сацыяльна значнай інфармацыі як патрабаванне пры адборы сродкаў інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці. Ранжыраванне сродкаў інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці (СМІ, «жывое слова», навукова-даведачная інфармацыя, даведачная літаратура, мастацтва). Класіфікацыя метадаў інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці. Характарыстыка метаду ілюстравання.

*Тэма 22. Класіфікацыя інфармацыйна-дыскусійных праграм*

Паняцце «інфармацыйна-дыскусійная праграма» як форма сцэнічнага ўвасаблення інфармацыйна-публіцыстычнага і пазнавальнага зместу. Тыпы і жанры інфармацыйна-дыскусійных праграм: інфармацыйна-асветніцкія (лекцыі, гутаркі, чытанні, даклады, вусныя часопісы і інш.), дыскусійныя (дыспуты, дыскусіі і інш.), камбінаваныя. Сродкі фарміравання зместу інфармацыйна-дыскусійнай праграмы: «факты жыцця» і «факты мастацтва», рэальны герой. Крытэрыі адбору пазнавальнага матэрыялу. Публіцыстыка ў змесце інфармацыйна-дыскусійных праграм. Характэрныя рысы і формы ўвасаблення публіцыстыкі. Характарыстыка клубнай публіцыстыкі. Асаблівасці работы з дакументальнай інфармацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 23. Тэхналогія падрыхтоўкі*
*і правядзення інфармацыйна-дыскусійнай праграмы*

Метадычныя патрабаванні па падрыхтоўцы і правядзенні інфармацыйна-дыскусійных праграм. Структура інфармацыйна-дыскусійных праграм. Спецыфіка сцэнарыя інфармацыйна-дыскусійных праграм. Алгарытм распрацоўкі інфармацыйна-дыскусійных праграм. Выбар тэмы і распрацоўка назвы праграмы. Выкарыстанне літаратурна-музычнага матэрыялу. Рэпетыцыя і правядзенне праграмы. Мастацкае афармленне аўдыторыі і яго асаблівасці. Крытэрыі ацэнкі праграмы.

*Тэма 24. Методыка падрыхтоўкі*
*і правядзення інфармацыйна-дыскусійных праграм*

Агульныя метадычныя патрабаванні да падрыхтоўкі і правядзення інфармацыйна-дыскусійных праграм. Алгарытм распрацоўкі інфармацыйна-дыскусійнай праграмы. Выбар тэмы і распрацоўка назвы праграмы. Адбор дакументальнага і мастацкага матэрыялу. Работа з экспертамі як тэхналагічны этап. Спецыфічныя асаблівасці выкарыстання інтэрв'ю-гутаркі. Выкарыстанне літаратурна-музычнага матэрыялу і сродкаў тэатралізацыі – адна з умоў эмацыянальнай выразнасці інфармацыйна-дыскусійнай праграмы. Рэпетыцыі і правядзенне праграмы. Мастацкае афармленне аўдыторыі і яго асаблівасці. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў у падрыхтоўцы і правядзенні праграмы. Крытэрыі ацэнкі праграмы.

*Тэма 25. Мастацтва вядучага*
*інфармацыйна-дыскусійнай праграмы*

Асноўныя патрабаванні да вядучага. Функцыі вядучага. Выкарыстанне граматычных і арфаэпічных норм як асновы культуры мовы. Моўныя сродкі выразнасці і іх выкарыстанне ў інфармацыйна-дыскусійнай праграме (метафара, алегорыя, гіпербала, інверсія, анафара і інш.). Тэхніка мовы. Моўныя навыкі і ўменні вядучага. Выразныя сродкі вядзення праграмы: пачатковая паўза, міміка, імідж вядучага. Гумар як сродак выразнасці. Імправізацыя і яе роля ў вядзенні інфармацыйна-дыскусійнай праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 4. Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці

*Тэма 26. Уводзіны. Прадмет і задачы раздзела «Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці». Абрады і святы і іх роля ў жыцці грамадства і асобы*

Уводзіны. Месца і роля раздзела «Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці» ў структуры вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогіі СКД». Праблема сучаснай святочнай культуры беларусаў. Месца свят і абрадаў у сістэме выхавання. Паняцці «традыцыя», «звычай», «абрад», «свята» і іх характэрныя асаблівасці. Паходжанне і сацыяльная роля абрадаў. Гістарычная эвалюцыя зместу, форм, тыпаў і функцый абраду. Асноўныя элементы абраду: слова, сімвал, музыка, дзейства, мастацка-дэкаратыўнае афармленне. Адметныя асаблівасці абраду – сімвалічнасць, умоўнасць, вобразнасць. Класіфікацыя абрадаў.

*Тэма 27. Сучасная сямейная абраднасць беларусаў*

Сямейна-бытавая абраднасць як састаўная частка сістэмы выхавання. Абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Асноўныя элементы народнага абраду. Рэлігійны абрад хрышчэння. Беларускае народнае вяселле. Рэлігійны абрад вянчання. Асаблівасць сучаснай вясельнай абраднасці. Святкаванне залатога і срэбнага вяселля. Пахавальна-памінальная абраднасць. Структура і характэрныя рысы сучасных пахаванняў і памінак.

*Тэма 28. Класіфікацыя свят і іх характэрныя асаблівасці*

Класіфікацыя свят, іх характэрныя асаблівасці, спецыфічныя рысы. Група агульнадзяржаўных, прафесійных і дзіцячых свят. Генезіс і тэндэнцыі развіцця свят у сучасных умовах. Адметныя рысы іх творчага вырашэння. Група рэгіянальных, сямейных свят, свят моладзі і свят мастацтваў – іх агульнанацыянальныя рысы і тэрытарыяльныя асаблівасці свят. Творчыя знаходкі і пралікі, шляхі іх пераадолення.

*Тэма 29. Выкарыстанне народных традыцый у сучасных святах зімовага і веснавога цыклаў*

Асноўныя элементы і функцыянальныя напрамкі каляндарнай абраднасці беларусаў. Традыцыі і навацыі ў каляндарна-абрадавым свяце Каляды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структура, характэрныя асаблівасці і адрозненні каляднага абраду, засевак, абраду шчадравання. Калядная варажба. Калядныя гульні і іх абрадавы сэнс. Асаблівасці масленічнага комплексу беларусаў. Масленічныя абрады і песні. Адраджэнне свята Праводзіны зімы ў Беларусі, яго структура. Традыцыйнае і новае ў веснавых святах беларусаў. Гуканне вясны. Абрады, звязаныя з заклікannем вясны. Велікодныя абрады і звычаі. Рэгіянальныя асаблівасці веснавых абрадаў і песень.

*Тэма 30. Традыцыі і навацыі*
*ў сучасных каляндарных святах летняга і асенняга цыклаў*

Агульная характарыстыка сучасных беларускіх свят летне-асенняга цыкла. Купальскія абрады і павер'і. Традыцыйныя і новыя элементы купальскага свята. Асенні перыяд беларускага земляробчага календара. Аграрная аснова свят Зажынкі, Дажынкі, Багач. Узнікненне, станаўленне і развіццё свята ўраджаю, яго характэрныя рысы. Беларускі кірмаш. Структура, гандлёвыя дзеянні, кірмашовы тэатр. Забавы і пацехі.

*Тэма 31. Характарыстыка асноўных кампанентаў свята.*
*Асноўныя этапы работы над сцэнарыем свята*

Тэатралізаваныя прадстаўленні. Жанры і віды, структура і архітэктоніка. Відовішча. Жанр, дзейная структура. Народнае гулянне як складальная частка свята. Структурныя кампаненты народнага гуляння. Стыль і заканамернасці народнага гуляння. Сучасныя прыёмы актывізацыі ўдзельнікаў свята. Асноўныя этапы работы над сцэнарыем свята.

*Тэма 32. Арганізацыйная работа*
*пастановачнай групы над увасабленнем свята*

Арганізацыйны камітэт і яго роля ў падрыхтоўцы свята. Схема аргкамітэта, функцыянальная накіраванасць яго асобных аддзелаў. Рабочы план падрыхтоўкі свята. Агульныя напрамкі арганізацыйнай работы пастановачнай групы. Дзейнасць галоўнага рэжысёра свята. Функцыі асістэнтаў рэжысёра. Арганізацыя рэпетыцыйнага працэсу. Работа балетмайстра, мастака, музычнага кіраўніка, гукарэжысёра. Фінансаванне свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
# ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | лабараторныя заняткі | | |
| **Раздзел 1. Тэхналогія гульнявой дзейнасці** | | | | | |
| 1 | Уводзіны. Педагагічныя магчымасці гульні ў выхаванні асобы | 2 | | | |
| 2 | Месца гульні ў культурнай дзейнасці асобы | 2 | 4 | | |
| 3 | Асаблівасці выкарыстання гульні ў клубных і пазашкольных установах | 2 | 6 | 2 | аналіз дзіцячых гульнявых праграм |
| 4 | Функцыі гульні. Класіфікацыя гульняў | 4 | 2 | | |
| 5 | Асаблівасці арганізацыі гульні з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту | 2 | 10 | 4 | гульнявыя карткі, практычнае правядзенне |
| 6 | Асаблівасці арганізацыі гульняў з падлеткамі і моладдзю | 2 | 6 | 4 | гульнявыя карткі, практычнае правядзенне |
| 7 | Гульнявая праграма як форма культурна-адпачынкавай дзейнасці | 2 | 10 | 4 | гульнявыя карткі, практычнае правядзенне |
| 8 | Тэхналогія мадэлявання гульнявых праграм | 2 | 6 | 2 | міні-праект праграмы |
| 9 | Прафесійныя якасці вядучага гульні | 2 | 4 | 2 | падрыхтоўка тэксту вядучага гульнявой праграмы |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел 2. Тэхналогія культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці** | | | | | |
| 10 | Уводзіны. Сацыяльная і псіхафізіялагічная сутнасць культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці | 2 | | | |
| 11 | Культурна-рэкрэацыйная дзейнасць як педагагічная сістэма | 2 | | | |
| 12 | Паняцце і класіфікацыя культурна-рэкрэацыйных праграм. Характарыстыка арганізацыі штодзённага адпачынку | 2 | | 2 | пісьмовы аналіз сцэнарыяў праграм |
| 13 | Комплексныя культурна-рэкрэацыйныя праграмы, іх характарыстыка | 2 | | | |
| 14 | Арганізацыя культурна-рэкрэацыйнай дзейнасці ў выхадныя і святочныя дні | 2 | | | |
| 15 | Падрабязная распрацоўка сцэнарных планаў асноўных комплексных культурна-рэкрэацыйных праграм | | 8 | 4 | пісьмовы аналіз па схеме |
| 16 | Методыка распрацоўкі сцэнарыя культурна-рэкрэацыйнай праграмы | | 14 | 2 | пісьмовы варыянт распрацаваных блокаў сцэнарыя |
| 17 | Тэхналогія падрыхтоўкі і правядзення культурна-рэкрэацыйных праграм | | 22 | 6 | прагляд і аналіз выканальніцкага майстэрства на лабараторных занятках |
| **Раздзел 3. Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці** | | | | | |
| 18 | Уводзіны. Мэта і задачы раздзела «Тэхналогія інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці» | 2 | | | |
| 19 | Інфармацыйна-адукацыйная дзейнасць у кантэксце арганізацыі вольнага часу асобы | 2 | | 2 | аналіз інфармацыйна-адукацыйных праграм |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 20 | Формы інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці | 2 | 10 | 4 | мультымедыйная прэзентацыя |
| 21 | Інфармацыйна-дыскусійная дзейнасць як неад'емны кірунак інфармацыйна-адукацыйнай дзейнасці. Сродкі і метады інфармацыйна-дыскусійнай дзейнасці | | 2 | 2 | падбор матэрыялаў для сцэнарыя інфармацыйна-дыскусійнай праграмы |
| 22 | Класіфікацыя інфармацыйна-дыскусійных праграм | | 10 | | |
| 23 | Тэхналогія падрыхтоўкі і правядзення інфармацыйна-дыскусійнай праграмы | 2 | | | |
| 24 | Методыка падрыхтоўкі і правядзення інфармацыйна-дыскусійных праграм | | 18 | 2 | афіша, запрашальны білет |
| 25 | Мастацтва вядучага інфармацыйна-дыскусійнай праграмы | | 4 | 4 | комплекс практыкаванняў для развіцця тэхнікі прамовы |
| **Раздзел 4. Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці** | | | | | |
| 26 | Уводзіны. Прадмет і задачы раздзела «Тэхналогія святочна-абрадавай дзейнасці». Абрады і святы і іх роля ў жыцці грамадства і асобы | 2 | 4 | 2 | аналіз свят і абрадаў, апытанне |
| 27 | Сучасная сямейная абраднасць беларусаў | 2 | 4 | 2 | распрацоўка эпізоду сцэнарыя |
| 28 | Класіфікацыя свят і іх характэрныя асаблівасці | 2 | 10 | 2 | распрацоўка ідэйна-тэматычнай задумы, апытанне |
| 29 | Выкарыстанне народных традыцый у сучасных святах зімовага і веснавога цыклаў | 2 | 8 | 4 | сцэнарны план фальклорнай праграмы |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 30 | Традыцыі і навацыі ў сучасных каляндарных святах летняга і асенняга цыклаў | 2 | 10 | 2 | эпізод фальклорнай праграмы |
| 31 | Характарыстыка асноўных кампанентаў свята. Асноўныя этапы работы над сцэнарыем свята | 2 | 10 | 4 | мантажная рэпетыцыя |
| 32 | Арганізацыйная работа пастановачнай групы над увасабленнем свята | 2 | 12 | 4 | |
| | **Усяго…** | **54** | **194** | **66** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Артеменко, З. В.* Азбука форм воспитательной работы / З. В. Артеменко, Ж. Е. Завадская. – Минск : Новое знание, 2010. – 314 с.

2. *Башмаков, А. И.* Креативная педагогика: методология, теория, практика / А. И. Башмаков ; под ред. Ю. Г. Круглова. – М. : МГОПУ им. М. А. Шолохова : Альфа, 2002. – 240 с.

3. *Герасимова, О. А.* Мастерство шоумена : учеб. пособие / О. А. Герасимова. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 192 с.

4. *Гуд, П. А.* Тэхналогія стварэння свята / П. А. Гуд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 223 с.

5. *Гурскі, А. І.* Святкаванне Каляд на Беларусі / А. І. Гурскі. – Мінск : Полымя, 1998. – 166 с.

6. *Жарков, А. Д.* Теория и технология культурно-досуговой деятельности : учебник / А. Д. Жарков. – М. : Изд. дом МГУКИ, 2007. – 480 с.

7. *Жарков, А. Д.* Теория, методика и организация социально-культурной деятельности : учебник / А. Д. Жарков. – М. : МГУКИ, 2012. – 456 с.

8. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность : учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников. – М. : МГУКИ, 2004. – 539 с.

9. Кодекс Республики Беларусь о культуре. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2016. – 272 с.

10. *Крук, Я.* Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар / Я. Крук. – Мінск : Полымя, 1998. – 213 с.

11. *Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Полымя, 2001. – 90 с.

12. *Петров, Б. Н.* Массовые спортивно-художественные представления / Б. Н. Петров. – М. : ТВТ Дивизион, 2006. – 376 с.

13. Технология социально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие / Л. И. Козловская [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 69–72.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Черняк, Ю. М.* Образный строй праздника и зрелища / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2003. – С. 3–148.

15. *Чечетин, А. И.* Основы драматургии театральных представлений : учебник / А. И. Чечетин. – СПб. : Лань, 2018. – 284 с.

16. *Шубина, М. Б.* Драматургия и режиссура : учеб. пособие / М. Б. Шубина. – СПб. : Лань, 2018. – 296 с.

17. *Ярошенко, Н. Н.* Социально-культурная анимация : учеб. пособие / Н. Н. Ярошенко ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – 2-е изд., испр. и доп. – М., 2005. – 126 с.

*Дадатковая*

1. *Ариарский, М. А.* Социокультурная деятельность как предмет научного осмысления / М. А. Ариарский. – СПб. : Арт-студия «Концерт», 2008. – 791 с.

2. *Бирюкова, Т. П.* Профессионализм и мастерство ведущего культурно-досуговых программ / Т. П. Бирюкова // Педагогика ненасилия в социокультурной деятельности ; под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Четыре четверти, 2009. – С. 144–151.

3. *Бирюкова, Т. П.* Отдыхаем всей семьей / Т. П. Бирюкова, Л. И. Козловская // Сценарно-методические рекомендации. – Минск : РНМЦ, 1986. – С. 27–74.

4. *Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Флинта, 1998. – 110 с.

5. *Гуд, Н. І.* Беларускі кірмаш / Н. І. Гуд, П. А. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 270 с.

6. *Жарков, А. Д.* Технология культурно-досуговой деятельности : учеб. пособие / А. Д. Жарков. – М. : МГУКИ, 1998. – 247 с.

7. *Жарков, А. Д.* Культурно-досуговая деятельность : учеб. пособие / А. Д. Жарков, В. М. Чижиков. – М. : МГУКИ, 1998. – 461 с.

8. *Козловская, Л. И.* Культурно-досуговая программа в структуре социокультурной деятельности / Л. И. Козловская // Социальная педагогика: проблема инкультурации личности / под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск : Четыре четверти, 2007. – С. 43–51.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Козловская, Л. И.* Социокультурная деятельность как средство реабилитации / Л. И. Козловская // Сац.-пед. работа. – 2005. – № 8. – С. 3–5.

10. *Козловская, Л. И.* Кафедра педагогики социокультурной деятельности: этапы развития и достижения / Л. И. Козловская // Вестн. СКД 2(24). – 2015. – С. 150–157.

11. *Камоцкий, М. В.* Культура быта молодежи: актуальные направления работы в условиях дополнительного образования : метод. разработка / М. В. Камоцкий. – Минск : ЦДОДиМ «Ветразь», 2015. – 56 с.

12. *Ліцьвінка, В.* Святы і абрады беларусаў / В. Ліцьвінка. – Мінск : Полымя, 1998. – 189 с.

13. *Новаторов, В. Е.* Культурно-досуговая деятельность : словарь-справочник / В. Е. Новаторов. – Омск : Алтайский гос. ун-т культуры, 1992. – 182 с.

*14.* Праздник в подарок / авт.-сост. М. С. Локалова. – Ярославль : Академия развития, 2003. – 335 с.

*15.* Праздники и обряды БССР. – Минск : Полымя, 1988. – 352 с.

16. *Рябова, Е. В.* Патриотическое воспитание подростков в туристско-экскурсионной работе / Е. В. Рябова // Сац.-пед. работа. – 2008. – № 7. – С. 48–52.

17. *Стрельцов, Ю. А.* Культурология досуга : учеб. пособие / Ю. А. Стрельцов. – 2-е изд. – М. : Моск. гос. ун-т культуры и искусств, 2003. – 296 с.

18. *Туник, Е. Е.* Тест Е. Торренса. Диагностика креативности : метод. руководство / Е. Е. Туник. – СПб. : ГП ИМАТОН, 1998. – 172 с.

19. *Чечетин, А. И.* Искусство театрализованных представлений / А. И. Чечетин. – М. : Сов. Россия, 1988. – 135 с.

20. *Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2003. – 350 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Для кантролю якасці адукацыі, у тым ліку з прымяненнем камп’ютарнага тэсціравання, рэкамендавана выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

1) тыпавыя заданні;
2) тэсты па раздзелах дысцыпліны;
3) вуснае апытанне падчас заняткаў;
4) складанне рэфератаў па раздзелах дысцыпліны;
5) выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па распрацаваных тэмах;
6) адкрытае пасяджэнне аматарскага аб’яднання;
7) абарона курсавых работ;
8) абарона сацыяльна-культурных праектаў;
9) творчы паказ;
10) справаздачная дакументацыя;
11) вусны экзамен.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная праца спрыяе пашырэнню і замацаванню ведаў, атрыманых студэнтамі падчас аўдыторных заняткаў, і накіравана на развіццё іх практычных уменняў і навыкаў. У рамках вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці» самастойная праца студэнтаў можа заключацца ў працы з лекцыйнымі матэрыяламі, працы з асноўнымі і дадатковымі крыніцамі па тэмах вучэбнай дысцыпліны, працы з электроннымі рэсурсамі, прапрацоўцыа пытанняў, вынесеных для самастойнага вывучэння, і падрыхтоўцы да лабараторных заняткаў, а таксама да залікаў і іспытаў.

## Прыкладныя заданні для кіруемай самастойнай работы студэнтаў

1. Прапрацоўка канспектаў лекцый і літаратуры па тэмах вучэбнай дысцыпліны.

2. Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па пытаннях, вынесеных на лабараторныя заняткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый па вывучаемых тэмах вучэбнай дысцыпліны.

4. Падрыхтоўка міні-праектаў па раздзелах вучэбнай дысцыпліны.

5. Прагляд і аналіз тэлевізійных (гульнявых, інфармацыйна-дыскусійных, святочна-відовішчных, культурна-рэкрэацыйных) праграм.

6. Падрыхтоўка матэрыялаў для распрацоўкі сцэнарыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ТЭХНАЛОГІІ**
**САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 0,93. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ